**Дэсантна-штурмавая** / падрыхт. М. Гарбачоў // Лепельскі край. – 2017. – 21 лют. – С. 2.

## ДЭСАНТНА-ШТУРМАВАЯ

Для таго каб стаць сапраўдным абаронцам Айчыны, трэба прайсці доўгі і няпросты шлях. Спачатку трэба набыць шырокія і трывалыя веды вайсковай справы, атрымаць выдатную фізічную загартоўку. Пётр Урбан усім гэтым у асноўным авалодваў яшчэ ў канцы 70-х – пачатку 80-х гадоў дваццатага стагоддзя, калі вучыўся ў Пышнянскай сярэдняй школе.

ІПтодзённа дабіраўся з вёскі Зацякляссе, дзе жыў разам з бацькамі. Пачатковую ваенную падрыхтоўку прадоўжыў у Лепельскім СПТВ–175. Вучыўся на механізатара і атрымаў правы вадзіцеля-прафесіянала катэгорыі «С». Восенню 1987 года прызвалі на тэрміновую службу ў армію. У той асенні прызыў сем чалавек з Лепельшчыны былі накіраваны для ўдзелу ў баявых дзеяннях у Афганістане. Разам з яшчэ земляком Ігарам Міснікам трапіў на пагранічную заставу ў пасёлку Маскоўскім Кулябскай вобласці Таджыкістана. Гэты населены пункт знаходзіўся на мяжы з Афганістанам. Петр Урбан быў уключаны ў склад вайсковай дэсантна-штурмавой групы.

У ваеннай часці прайшоў трохмесячнае навучавне на гранатамётчыка, авалодаў навыкамі карыстання ў баявых умовах буйнакаліберным гранатамётам СПГ–9. Душманы такой зброі баяліся, называлі «шайтан-труба».

– На верталётах Мі–8 перыядычна пераляталі ў Афганістан, накіроўваліся на дапамогу нашым ваеннаслужачым для знішчэння вайсковых злучэнняў ворага, – сказаў Пётр Урбан. – Звычайна вельмі хутка выгружаліся ў нашых апорных пунктах на тэрыторыі гэтай краіны, перад выкананнем канкрэтных баявых задач займалі кругавую абарону і толькі пасля гатага праводзілі рэкагнастыроўку. У склад нашай дэсантна-штурмавой групы ўваходзілі таксама аўтаматчыкі, снайперы і мінамётчыкі. Аднойчы высадзіліся на нашых старых, належным чынам абсталяваных пазіцыях, а яны аказаліся замініраванымі. Адзін салдат падарваўся на варожай міне, загінуў, а некалькі ваеннаслужачых атрымалі цяжкія кантузіі. Пасля гэтага выпадку мы далі сабе зарок – ніколі больш не выкарыстоўваць нашы старыя ваенныя ўмацаванні. – Колькі доўжыліся камандзіроўкі ў Афгашстан?

– Звычайна ад двух сутак да тыдня. Праўда, аднойчы давялося выконваць баявыя задачы на працягу двух тыдняў. Асабліва абвастрылася сітуацыя, ваенная абстаноўка ў канцы 1988 года – пачатку 1989 года, калі вялася падрыхтоўка да поўнага вываду нашых войскаў з Афганістана і ў сувязі з гэтым рэзка актывізав-ліся дзеянні душманаў супраць нашых войскаў.

– Калі дэмабілізавалі?

– У лістападзе 1989 года.

– Як склаўся далейшы лёс?

– Вярнуўся ва малую радзіму. Уладкаваўся вадзіцелем у калгас «Салют». Ажаніўся на мясцовай дзяўчыне Валянціне. Калгас выдзеліў маей сям’і добраўпрадкаванае жыллё ў Стаях. Цяпер працую вадзіцелем у ЗАТ «Віцебскаграпрадукт». Разам з жонкай вырасцілі і выхавалі двух дзяцей – сына Аляксандра і дачку Марыю. Маем ужо нават унука Марка, якому хутка споўніцца два гады.

*Падрыхтаваў Мікалай* ***ГАРБАЧОЎ***